меннік, педагог. Пісаў на польск. і лац. мовах. З 1749 выкладаў паэтыку і рыторыку ў Нясвіжскім калегіуме, Гродне, Мінску, Полацку. У 1772 і 1773 наведаў Пецярбург, пра які напісаў на лац. мове паэму «Пецярбург — царыца паўночных гарадоў». Аўтар барочных трагедый на польск. мове «Марнасць над марнасцю, або Томас Паўнд» (1775) і «Сіроэс» (паст. ў 1755 і 1758 у Нясвіжскім калегіуме) на сюжэты зах.-еўрап. гісторыі, кн. «Плач князёўны Ганны з Мыцельскіх Радзівіл... над сваім мужам пры пахаванні» (1763), «Казанне на пахаванні... Ф.Жабы» (1772). *А.В.Мальдзіс.*

**КАЎБАСА́**, к і л б а с а, мясны выраб. Мяккае мяса з лапатак і інш. частак свіной тушы, часам паляндвіцу, дробна сякуць (у наш час пракручваюць на мясарубцы), дадаюць парэзанае сала, соль, часнок, укроп, гарчыцу, каляндру, кмен, перамешваюць і гэтым шчыльна начыняюць тонкія свіныя кішкі. Раней мяса напіхвалі ў кішку рукой, развёўшы яе дроцікам або лубяной дужкай. Выраблялі К. восенню ці ранняй зімой да *Дзядоў* і *Каляд*. Часцей за ўсё К. вялілі ці вэндзілі. Шырока былі распаўсюджаны крывяныя К. (крывянкі) з дабаўленнем мукі і круп, кіндзюк (каўбух, коўбік) — свіны страўнік, запоўнены фаршам. К. выкарыстоўвалася і як самаст. выраб, так і ў складзе страў (бігас і інш.). У Беларусі ў наш час хатні кустарны выраб К. шырока распаўсюджаны.

**КА́ЎКА** Аляксей Канстанцінавіч (н. 20.9.1937, в. Машчаліна Чэрвеньскага р-на), беларускі гісторык і літаратуразнавец, грамадскі дзеяч. Д-р філал. навук (1991), канд. гіст. навук (1971). Скончыў БДУ (1961), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1971). З 1954 на культ.-асветнай і камсамольскай рабоце. У 1971—79 і 1983—87 у Ін-це эканомікі сусв. сацыяліст. сістэмы АН СССР, у 1979—82 прадстаўнік Саюза сав. т-ваў дружбы і культ. сувязей з заграніцай, саветнік пасольства СССР у Польшчы. У 1987—89 гал. рэд. час. «Советское славяноведение», з 1989 у Ін-це сусв. л-ры імя М.Горкага Рас. АН. Даследаваў гісторыю Польшчы, польск. рабочага руху, сав.-польск. адносін. З канца 1970-х гг. распрацоўвае праблемы адраджэння і станаўлення нац. самасвядомасці беларусаў, творчасці Ф.Скарыны, Я.Купалы, К.Езавітава, І.Луцкевіча, В.Ластоўскага, М.М.Улашчыка і інш. Укладальнік літ.-навук. штогоднікаў «Скарыніч» (вып. 1—3, 1991—97).

*Тв.:* Тут мой народ: Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI — пачатку XX ст. Мінск, 1989; Жывом!: Старонкамі бел. самапазнання. М.; Мінск, 1997; Будам жыць!: Пра тое самае. Мінск; М., 1998; От Скорины до Купалы: Белорусская литература в контексте национально-культурного возрождения. М., 2006; Каб не забыцца: допісы розных гадоў. Мінск, 2006.

**КАЎПЕ́НЬ**, вёска ў Лоеўскім р-не. За 7 км на З ад г.п. Лоеў, 58 км ад чыг. ст. Рэчыца на лініі Гомель—Калінкавічы, 95 км ад Гомеля. Цэнтр Каўпенскага с/с. 170 гаспадарак, 465 ж. (2012).

Вядома з 18 ст. як вёска ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяв. ВКЛ. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у Рас. імперыі, у Рэчыцкім павеце Мінскай губ. У 1850 вёска ў Лоеўскай воласці, 55 двароў, 294 ж. У 1897 — 113 двароў, 766 ж., школа, магазін. З 26.4.1919 у Гомельскай губ. РСФСР. З 8.12.1926 у БССР, цэнтр сельсавета ў Лоеўскім р-не Рэчыцкай, з 9.6.1927 да 26.7.1930 Гомельскай акруг. З 30.12.1927 у Крупейскім с/с. З 20.2.1938 у Гомельскай вобл. У Вял. Айч. вайну з канца жн. 1941 да сярэдзіны кастр. 1943 К. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. З 16.7.1954 у Казярожскім с/с. У 1959 — 664 ж. З 25.12.1962 да 30.7.1966 у Рэчыцкім р-не. З 17.7.1986 зноў цэнтр сельсавета. У 1998 — 199 гаспадарак, 534 ж.

У 2012 базавая школа—сад, Дом культуры, б-ка, ФАП, комплексны прыёмны пункт, аддз. сувязі, 3 магазіны. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Археал. помнікі: гарадзішчы мілаградскай і зарубінецкай культур, курганны могільнік.

**КАЎТУНО́ВА** Марыя Паўлаўна (16.11.1915, в. Неглюбка Веткаўскага р-на — 13.9.1990), беларускі майстар народнага мастацкага ткацтва. Працавала ў тэхніках закладнога і перабарнага ткацтва, выраблялы посцілкі і ручнікі ў мясц. традыцыях (гл. *Неглюбскія ручнікі*). Удзельнік, дыпламант, лаўрэат многіх выставак, конкурсаў, фестываляў, у т.л. 1-га Усесаюзнага фестывалю аматарскай творчасці працоўных (1975—77). *Я.М.Сахута.*

**КАЎЧЭ́Г** у а б р а з е, заглыбленая паверхня дошкі, дзе змяшчалася кампазіцыя. Рабіўся на адлегласці 2—7 см ад краёў на глыбіню 2—3 мм. У Беларусі сустракаецца ў абразах канца 14 — пач. 16 ст.: «Маці Божая Замілаванне» (канец 14 — пач. 15 ст.), «Маці Божая Адзігітрыя Смаленская» (канец 15 ст.), «Маці Божая Прадвесце» (канец 15 — пач. 16 ст.; усе з Брэстчыны) і інш.

**КА́ФЛЯ** (ням. Kachel), керамічныя пліткі для абліцоўкі печаў, камінаў, сцен у памяшканнях. З пярэдняга (вонкавага) боку бываюць гладкія, рэльефныя, пакрытыя белай або каляровай глазурай (маёлікавыя К.), а таксама неглазураваныя (тэракотавыя); паводле формы — плоскія, вуглавыя, карнізныя. З адваротнага боку маюць выгляд адкрытай скрынкі (румпы) для замацавання ў муроўцы. Вырабляюцца з сярэднепластычных ганчарных мергелістых і фаянсавых глін у драўляных формах ці ўручную. Сфармаваную К. высушваюць, потым абпальваюць у печах пры тэмпературы да 1150 °С. К. часта няправільна называюць *плітку дэкаратыўную* без румпы на тыльным баку. У Беларусі пашырана з 14 ст. Першапачаткова яе выраблялі рамеснікі-ганчары, з 18 ст. кафлярства вылучылася ў асобную галіну прам-сці. У 14—

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

16 ст. рабілі гаршковыя К. з вусцямі рознай канфігурацыі, дно зрэдку дэкарыравалі. У 15 ст. пачалі вырабляць каробчатую К., для якой характэрны высокая рамка і круглая румпа, прымацаваная да квадратнай пласціны; больш познія вырабы выконваліся з невысокай прамавугольнай румпай і вял. квадратнай або прамавугольнай пласцінай, звычайна аздабляліся геаметрычным узорам, выявамі раслін, жывёл, сюжэтнымі кампазіцыямі на быт., гіст. і рэліг. тэмы. У канцы 16 — 1-й пал. 17 ст. бел. кафлярства дасягнула найб. росквіту. Маст. якасцямі вызначалася паліхромная К., пакрытая белай, жоўтай, светла- і цёмназялёнай, блакітнай, цёмна-сіняй, карычневай палівай. У аздабленні К. (асабліва канца 17 — пач. 18 ст.) пераважала раслінная і геральдычная тэматыка, часам з надпісамі лацінкай або кірыліцай, пазначэннем года вырабу. З 2-й пал. 17 ст. К. выраблялі ў т.зв. дывановым стылі, дзе кожная асобная К. складала частку агульнага малюнка паверхні печы. Бел. кафлярства 17 ст. значна паўплывала на развіццё вытворчасці К. ў Рус. дзяржаве, дзе працавалі бел. майстры з Копысі, Мсціслава, Дуброўна, Віцебска і інш. гарадоў, у іх ліку Пётр *Заборскі* і Сцяпан *Палубес* (іх вырабамі аздоблены Церамны палац Крамля, Круціцкі церам, царква Георгія Неакесарыйскага ў Маскве, Васкрасенскі сабор Новаіерусалімскага манастыра на Істры і інш.). У 18 ст. памеры К. павялічыліся, мадэліроўка рэльефаў ускладнілася. У аздабленні печаў і камінаў, якія рабілі ў выглядзе ярусных цыліндраў, абеліскаў і інш. на багата дэкарыраваных цокалях, выкарыстоўвалі вял. К.-ўстаўкі з гарэльефнымі выявамі раслін, жывёл, чалавека. Шырока выкарыстоўваліся гладкія, размаляваныя кобальтам К., т.зв. галандскія, у размалёўцы якіх пераважалі адлюстраванні гіст., батальных, жанравых сцэн, пейзажаў, кніжных ілюстрацый, абразоў. К. канца 19 — пач. 20 ст. вызначалася рысамі стылю *мадэрн* і мела форму рэльефных, паліхромных чатырохвугольных плітак або фасонных дэталей (медальёнаў, карыятыд, ільвіных галоў і інш.). У той час у Беларусі працавалі кафляныя заводы ў Бабруйску, Барысаве, Віцебску, Івянцы, Копысі, Мінску, Магілёве, Навагрудку і інш. Зараз паліваную К. вырабляе кафляны цэх Аршанскага камбіната сілікатных вырабаў. Гл. таксама *Віцебская кафля, Гродзенская кафля, Заслаўская кафля, Зэльвенская кафля, Копыская кафля, Магілёўская кафля, Мірская кафля, Мсціслаўская кафля.*

*Літ.:* Абецедарский Л.С. Белорусы в Москве XVII в. Минск, 1957; Трусаў А.А., Угрыновіч У.В. Беларуская паліхромная кафля // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1983. № 4; Беларуская кафля. Мінск, 1989; Белорусы Москвы. XVII в. Минск, 2013.

*А.А.Трусаў, У.В.Угрыновіч.*

**КАФТА́Н**, каптан, мужчынскае верхняе адзенне магнатаў і гар. знаці ў 16—17 ст. Прыйшоў з Персіі і Турцыі ў Рэч Паспалітую, адтуль праз Беларусь трапіў у Расію. Расхінная вопратка з шырокім падолам і доўгімі рукавамі, якую зашпільвалі ўстык гузікамі на 6—8 пятліц; у падоле і па баках меліся разрэзы з пятліцамі. Шылі з аксаміту, парчы або дарагога сукна. У 17 ст. рабілі з багата аздобленым стаячым каўняром. Т.зв. станавы К. шылі шчыльным да стану, з кароткімі рукавамі. Польск. К. быў адразным па таліі; ліф шчыльна ахопліваў фігуру, ніжняе шырокае крыссе прызборвалася; рукавы кроіліся вельмі шырокімі і пышнымі каля плячэй і вузкімі ад локця да кісці. У 19 ст. ў Беларусі К. называлі вопратку менш заможнага насельніцтва, звычайна прамога крою, з адкладным каўняром, з сукна або палатна.

**КАХА́НАВІЦКАЯ СЯДЗІ́БА**, помнік сядзібна-паркавай архітэктуры 19 ст. ў в. Каханавічы Верхнядзвінскага р-на. Належала Я.Храпавіцкаму. Сядзібны дом — драўляны прамавугольны ў плане асн. аб'ём, накрыты 4-скатным гонтавым дахам. У пач. 20 ст. быў прыбудаваны па цэнтры 4-калонны ганак з балконам, з боку ўезда размяшчаўся аркадны порцік. Да гал. фасада па баках прымыкалі кароткія крылы, а пасярэдзіне — 3-сценны рызаліт, уздоўж якога цягнулася галерэя з лесвіцамі. Вонкавыя сцены неатынкаваныя, вокны і дзверы лакіраваныя белым колерам. Унутры пакоі былі аформлены ў стылі ампір, абаграваліся печамі з белай кафлі, дэкарыраванай авальнымі разьбянымі медальёнамі. У доме захоўваўся багаты збор маст. рэчаў: абразы, старадаўняе серабро, крышталь, вырабы з бронзы, партрэты, размяшчалася б-ка (некалькі тыс. тамоў на польск., франц., ням. і інш. мовах). Да гал. фасада вяла пад'язная алея, перад уваходам знаходзіўся гладка стрыжаны газон, аздоблены пасярэдзіне клумбай. Вакол дома размяшчаліся парк (20 га), сад (10 га), аранжарэя, у якой вырошчваліся пальмы, агавы і інш. Захавалася 5 ліпавых алей. Сядзіба разбурана ў 1918.

**КАХА́НАВІЦКІ НАРО́ДНЫ АМА́ТАРСКІ КЛУБ «БЕ́ЛЫЯ ВАРО́НЫ»**. Створаны ў 1989 у в. Каханавічы Верхнядзвінскага р-на пры сельскай б-цы. У 2002 прысвоена званне «народны аматарскі калектыў». Заснавальнік і маст. кіраўнік П.П.Квяцінскі. У складзе 20 чал. ва ўзросце ад 10 да 75 гадоў. Асн. мэта дзейнасці — папулярызацыя здаровага ладу жыцця сярод дзяцей і моладзі. Формы работы: дні здароўя, лекцыі, інфармацыйныя гадзіны. Удзельнікі займаюцца рэстаўрацыяй парку І.Храпавіцкага, доглядам брацкіх магіл у вёсках Выдрыцкія, Гараваткі, Крыжборак і інш. Калектыў — дыпламант рэсп. фестывалю нар. мастацтва «Беларусь — мая песня» (Віцебск, 2005); удзельнік рэсп. велапрабегу «Праз спорт да здароўя кожнага і дабрабыту нацыі — разам!» (Мінск, 2008), абл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ